Падтрымай "Вясну" на PATREON

Актывістка Наталля Саматыя аштрафаваная за ўдзел у акцыі 19 верасня

21.10.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Наталля Саматыя. Фота Радыё Свабода.

Суд Маскоўскага раёна Мінску аштрафаваў актывістку Наталлю Саматыя на 50 базавых велічынь (1050 рублёў) за ўдзел у акцыі "Праспект нацыянальнага сцяга". Такое рашэнне 21 кастрычніка прыняў суддзя Віктар Казак.

Актывістку абвінавацілі ў тым, што яна 19 верасня з 19.00 да 20.00 удзельнічала ў пікеце на вуліцы Кастрычніцкай у Мінску "з мэтай публічнага выказвання сваіх адносін да 25-ай гадавіны з дня прыдання "бел-чырвона-беламу" сцягу і гербу "Пагоня" статусу дзяржаўных сімвалаў. Пры гэтым яна трымала ў руцэ "бел-чырвона-белы" сцяг, выкрыквала лозунг "Жыве Беларусь". Тым самым Наталля парушыла ўстаноўлены парадак правядзення пікетавання, прадугледжаны законам "Аб масавых мерапрыемствах".

Па выніках судовага паседжання Наталля Саматыя прызнаная вінаватай у парушэнні ч. 3 арт. 23.34 КоАП (удзел у правядзенні несанкціянаванага масавага мерапремства паўторна цягам аднаго году пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне).


“Я не прызнала сябе вінаватай. Пацвердзіла, што была на акцыі, бо з'яўляюся грамадзянкай Беларусі і жыхаркай Мінска, нарадзілася і вырасла тут і лічу законным знаходзіцца ў любым месцы”, - пракаментавала рашэнне суда Наталля Саматыя.

Твитнуть










Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў




ГАЛОЎНАЕ

Дзень палітвязняў Беларусі. Да якіх мерапрыемстваў можна далучыцца?



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

Бацьку і дачку пакаралі "хатняй хіміяй" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Палітзняволенаму Яну Папковічу прысудзілі 4 гады калоніі

Сяржук Сыс – Валянціну Стэфановічу: "Ганаруся табой, тваёй воляй і характарам"

Праваабаронца і валанцёрка "Вясны" Марыя Тарасенка: "Я маю ўнікальную магчымасць падтрымліваць людзей"

"Яго місія ў большым. Яго мэта — нешта дасягнуць і даказаць": вязні шклоўскай калоніі пра Вітольда Ашурка

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА


ENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY